дзя вас зразумеюць бяз словаў людзі самага рознага паходжаньня, адукацыі, але аднолькавага жыцьцёвага досьведу: непісьменны слуцкі селянін-паўстанец і акадэмік-нацдэм, верніца-баптыстка і менскі школьнік, студэнт унівэрсытэту і журналіст.

*Краты* — мова, на якой чалавек гаворыць зь дзікімі зьвярамі і зьдзічэлымі *homo sapiens*. Праўда, зусім ня *краты* вызначаюць, хто знаходзіцца на якім іх баку — хто *закратаваны*, хто не.

Апатэоз *кратаў* наступіў у XX-м стагодзьдзі, калі за *кратамі* пабывала людзей больш, чым за ўсе папярэднія, разам узятыя. *Краты* — безумоўны сымбаль стагодзьдзя, ягоная родавая адзнака.

У беларускую мову *краты* прыйшлі з лаціны. Статут рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, які ў 20-я гады быў надрукаваны ў Беларусі, патрабаваў, каб перад уваходам у казарму абавязкова ляжала „*кратка* для абціраньня ног". Гэта ці не адзіны выпадак спробы пашырэньня сэмантычнага поля слова, якое нашае стагодзьдзе намёртва загнала ў адзін шэраг са словамі арышт, этап, кайданы, турма, саветы і, канечне, першы прэзыдэнт.

# Краявід

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Краявід* — складанае слова, складаная зьява. *Краявід* можа быць які заўгодна: сумны, радасны, змрочны, сонечны, маляўнічы ці жахлівы. Але, нягледзячы на азначэньні, само слова *краявід* дадае фразе паэтычнасьці.

> Я хаджу закаханы ў твае *краявіды*
> І шапчу я прызнаньні, о, мой край дарагі,

— напісаў Генадзь Бураўкін.

Пэйзаж, ляндшафт і малюнак (апошняе — у пераносным значэньні) — такія падае слоўнік Клышкі сынонімы да *краявіду*. А ў слоўніку Ластоўскага яно падаецца ў форме *краёвідзь*, пасьля якога чытаем сынонім: спазор.

Тыпы беларускага *краявіду*: вясковы і гарадзкі, раўнінны і ўзгорысты, азёрны, лясны, пушчанскі. Карацей, усё як у людзей, калі не лічыць чарнобыльскага *краявіду* — пакінутых, разбураных і разрабаваных селішчаў, пачварных жывёлінаў, ненатуральна вялікіх расьлінаў...

*Краявід* ня мае гаспадара. Гэты кавалак абшару мне не належыць, але захапляцца *краявідам* я магу. Чалавек заўсёды імкнецца ўжываць тое, што мае. Хто толькі ня зьдзекаваўся, хто толькі не зьмяняў нашых *краявідаў*! Войны, навалы, будаўнікі, дрывасекі, мэліяратары. Хто толькі не ўпрыгожваў іх — Боская ласка, рупнае дбайства, дойліды і садоўнікі.

# Кросны

***Рыгор Барадулін***

*Кросны*. У слове гэтым чуецца: кроза і сны. Нашыя прабабкі і бабкі, маці нашыя колькі крозаў сасьнілі, ткучы сабе пасаг доўгімі зімовымі вечарамі. А за вокнамі сутыкаліся ноч і дзень, і ткаліся суткі — палатніны вечнасьці. Усё, наагул, тчэцца ў навакольлі: і дождж, і туман, і мроіва, і сутоньне. Сумная ўсьмешка пяяла: